# “Спадзяюся, што гэта будзе добрым сігналам” – Лукашэнка пра сустрэчу з дэпутатам Вярхоўнай рады Украіны Яўгенам Шаўчэнкам

Яўген Шаўчэнка і Аляксандр Лукашэнка

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што яго сустрэча з народным дэпутатам Вярхоўнай рады Украіны Яўгенам Шаўчэнкам стане добрым сігналам і будзе садзейнічаць развіццю адносін дзвюх краін, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

“Прыемна з вамі сустрэцца. Аказваецца, ёсць яшчэ ва Украіне людзі, якія паважаюць Беларусь”, – прывітаў кіраўнік дзяржавы госця ў Палацы Незалежнасці.

> ***“Не проста паважаюць, а любяць і цэняць. Для мяне вельмі вялікі гонар з вамі пазнаёміцца, я даўно марыў. Праўда, шчыра”, – адказаў Яўген Шаўчэнка.***

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для яго таксама важна гэта сустрэча. “**Па-першае**, нагода пагаварыць пра беларуска-ўкраінскія адносіны. Мы, напэўна, мала гаворым апошнім часам наогул на гэту тэму. А калі гаворым, то не заўсёды пазітыўна. Ведаю, што адбываецца на маёй роднай Украіне. Вы ведаеце маё стаўленне да Украіны – не толькі як Прэзідэнта, але і маё асабістае стаўленне. Таму вельмі важна гэта наша сустрэча як такі добры сігнал. Я спадзяюся, што гэта будзе добрым сігналам, зыходзячы з таго, што я ведаю пра вас і вашу пазіцыю наконт беларуска-ўкраінскіх адносін і наогул адносна

Беларусі", – сказаў Прэзідэнт.

**Па-другое**, кіраўнік дзяржавы разлічвае, што гэта сустрэча стане добрым пачаткам супрацоўніцтва сапраўдных патрыётаў Украіны з Беларуссю. "Мы ніколі нічога не ўтойвалі ад украінскіх нашых сяброў, утойваць не маем намеру і ў далейшым, тым больш ад нашых сяброў. Можа, я думаў, што іх (колькасць. – Заўвага БЕЛТА) зменшылася, але наўрад ці. Напэўна, проста пра іх менш гавораць і яны, магчыма, менш гавораць апошнім часам. Але не думаю, што ў нас там менш сяброў", – заўважыў беларускі лідар.

БЕЛТА